**Халецкі, А. У.** Яроха Сяргей Ягоравіч / А. У. Халецкі // Памяць. Віцебскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: А. П. Красоўскі [і інш.] ; уклад. У. І. Мезенцаў; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Мастацкая літаратура, 2004. — С. 709.

## ЯРОХА СЯРГЕЙ ЯГОРАВІЧ

Нарадзіўся ў 1961, лейтэнант, лётчык-аператар верталёта, загінуў пры выкананні баявога задання 27.05.1982, пахаваны ў в. Пушча.

Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

### *Крылы для ўзлёту*

Заданне было дакладным і крайне сціплым: знішчыць групу душманаў, што заселі ў адным з горных раёнаў. Тры баявыя верталёты ўзняліся ў паветра. Вызначаны раён сустрэў іх моцным аўтаматным і кулямётным агнём праціўніка. Першыя дзве машыны прайшлі на брыючым палёце і пачалі рабіць новы захад, а экіпаж, у якім змагаўся лётчык-аператар лейтэнант С. Я. Яроха, не паспеў. Варожыя кулі прашылі верталёт, гарачым свінцом апякло ногі і рукі Сяргея, але ён заставаўся баяздольным.

Камандзір зноў павёў машыну на душманскі «ланцуг»… З зямлі ўжо «агрызаліся» проціпаветранай зброяй…

Гэты вылет быў не першым у баявой біяграфіі С. Ярохі. Ён ужо меў адно раненне… 27 мая 1982 года яго не стала, ён загінуў пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку.

*А. У. Халецкі*